УДК 826-32.09

К.С. Карнялюк

# Магчымасці ліра-эпасу ў жанравай форме трылогіі Я. Коласа «На ростанях»

У сучасным літаратуразнаўстве лірызм разглядаецца як якасна новы ў параўнанні з эпічным прынцып мастацкага адлюстравання не толькі ўнутранага свету аўтара ці яго героя, але і навакольнай рэчаіснасці. Узнікненне лірыкі як літаратурнага роду адносяць да Антычнасці. Аднак, як справядліва заўважыў А. Эльяшэвіч, «...спатрэбіўся яшчэ шэраг стагоддзяў, каб лірычнае з абазначэння спецыфічнага роду літаратуры змагло ператварыцца ў суверэнны прынцып мастацкага ўсведамлення рэальнасці» [1].

Адразу адзначым, што лірызм – устойлівая рыса многіх беларускіх пісьменнікаў пачатку XX ст. (Я. Колас, Я. Купала, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Ц. Гартны і інш.). Літаратуразнаўцамі (А. Лойка, І. Навуменка, М. Мушынскі, М. Ярош, А. Яскевіч) неаднаразова падкрэслівалася, што для многіх твораў беларускай літаратуры характэрны лірызм, які праяўляецца нават тады, калі гутарка ідзе аб самых звычайных празаічных рэчах. З.П.Мельнікава адзначае: «Развіццё суб'ектыўна-аўтарскай эмацыянальнасці, узнікненне лірызму, індывідуальна-творчай манеры выражэння думак і пачуццяў аўтара і яго герояў, уласцівых беларускай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст., генетычна ўзыходзіць да традыцый народнай ацэначнасці, дыдактычнай мудрасці, закладзенай у фальклоры. На аснове народных ацэначных крытэрыяў выраслі індывідуалізаваныя экспрэсіўныя адносіны да рэчаіснасці, той творчы пачатак, які ў літаратурным працэсе развіўся ў аўтарскі лірызм» [2].

Лірычны пачатак актыўна пранікае ў жанравую структуру трылогіі Я. Коласа «На ростанях»: споведзі герояў, асабліва Лабановіча, адлюстроўваюць сабыццё іх жыцця з жыццём народа, і лёс народа, які канцэнтруецца ў іх лёсе, лірычна імі перажываецца. Да таго ж нельга пагадзіцца з тым, што і апавядальнік як быццам з боку назірае за падзеямі, апавядае, не даючы волі асабістым прыхільнасцям. На наш погляд, вобраз аўтара ў трылогіі ўяўляе нейкую ідэальную мадэль той эмацыянальна-лірычнай рэакцыі, якая павінна ўзнікнуць у кожнага, хто даведваецца пра лёс героя. Шматлікія лірыка-публіцыстычныя «выхады» аўтара-відавочцы, аўтара-адрасата, аўтара-рэтранслятара ў прозе Коласа, акрэсліваючы псіхалагічныя і філасофскія грані лёсу героя, ясна выражаюць «асабістыя прыхільнасці». Іншая справа, што ўсё ж асноўная функцыя вобразу аўтара – не стварэнне сферы вольнага перажывання, а сінтэзаванне ў структурнае адзінства эпіка-падзейнага раду і экспрэсіўна-выразнай сістэмы споведзі. Аўтар знаходзіцца ў нейкай сюжэтнай метапрасторы, якая з падзейным аспектам твора стварае адзіны паэтычны свет, і з гэтага боку яго функцыя – уключаць лёс героя ў сістэму каардынат вечных каштоўнасцей.

І, наогул, асэнсаванне «лірычнасці» таго ж Лабановіча адбываецца на перасячэнні розных пунктаў гледжання: аўтара, які неўпрымет прысутнічае ў

мастацкай сістэме трылогіі, непасрэднага назіральніка-апавядальніка, слухача-чытача. Такая іерархічная сістэма «суб'ектыўных прызм» (В.У. Вінаградаў) – свайго роду эквівалент змены апавядальнікаў у творы. Яна, на нашу думку, дазваляе не толькі шматгранна адлюстроўваць унутраны свет героя, але і, пераадольваючы лакалізацыю канфлікту, «уцягваць» іх у разнастайнае кола жыццёвых супярэчнасцей.

У прозе Коласа адразу заўважаюцца лірызм і нейкая далікатная стрыманасць у абмалёўцы нават самых трагічных падзей (узяць хоць бы вынікі настаўніцкага з'езду ці арышт Лабановіча). І, на нашу думку, гэтыя лірызм, стрыманасць і недагаворанасць і ствараюць той глыбокі пачуццёвы кантэкст, які немажліва выказаць нават самымі дакладнымі словамі, і які, адчуваецца, і жыве па-за словам, знаходзячы водгук у душы чытача.

Яшчэ ў «Казках жыцця» мы заўважаем характэрную і ярка выяўленую рысу «казак» – лірычную плынь, якая выяўляецца ў суб'ектывізаваным, эмацыянальна-ўзрушаным характары пісьма. Аднак адразу дададзім, што лірызм Коласа нельга змешваць ні з пыхоўным трагічна-рамантычным, поўным гіпербал і замоўчванняў лірызмам Байрана, ні з палка-рэлігійным лірызмам Навaліса. Коласаўскі лірызм, на нашу думку, з'яўляецца першаэлементам і душой прозы. Гэта лірызм амаль паўтонаў, лірызм мяккай задуменнасці і журбы.

У трылогіі часта з'яўляюцца вобразы прыроды, зямлі, неба, якія па сваёй сутнасці шматзначныя. Бо героі, асабліва Лабановіч, якраз у натуральнай лучнасці з прыродаю, у блізкасці да яе знаходзяць душэўны спакой, набіраюцца сіл. Таму і сама прырода напаўняецца чалавечымі пачуццямі, адухаўляецца. Яна таксама, як і чалавек, поўніцца радасцю жыцця: «Эх, як прывольны прасторы наднямонскіх лугоў! Часамі над прасторамі зялёнага мора, як вартаўнікі, узніміліся пышныя постаці адзінокіх дрэў, пераважна дубоў, параскіданых дзе-нідзе сярод лугу, а месцамі і цэлыя дубовыя гаі. Многа тут для іх прастору і сонца. Ёсць дзе разгарнуцца іх магутным карэнням, камлям і галінам» [3].

Бясспрэчна, што пісалася трылогія з вялікай душэўнай узрушанасцю і неадольнай прагай маральнага ачышчэння. І самі рамантычныя тэндэнцыі выразней выяўляюцца менавіта тады, калі спакойнае аб'ектывізаванае апавяданне змяняецца праніклёным, страсным пачуццём, калі на ўсю моц раскрываецца лірычны талент мастака. А лірычнае, суб'ектыўнае найбольш увасабляецца ў выключным, значным, рамантычным. Так, пафасам захаплення, радасцю жыцця прасякнуты адносіны Лабановіча і Ядвісі, Лабановіча і Андросавай. Але, канешне ж, і самі старонкі, прысвечаныя Палессю і палешукам: «Далёка беглі ўздоўж дарогі высокія тэлеграфныя слупы з белымі гугачкамі і роўна нацягнутым дротам. Ветру не было, а дрот беспарастанку гуў прыемным звонам, ціхім, аднатонным і жаласным, як казка гэтых панурых лясоў і балот Палесся» [3, с.41].

Трылогія сагрэта аўтарскім лірызмам. У ёй ужо выразна акрэслена ўменне пісьменніка заглыбіцца ў псіхалогію герояў, перадаць душэўны стан, раскрыць іх пачуцці (напрыклад, Ядвісі і Лабановіча) на тым этапе ўзаемаадносін, калі недагаворанае адчуеш альбо зразумееш нават без слоў. І ў трылогіі і лірызаванасць, адкрытая эмацыянальнасць, і ўяўная рамантызацыя (асабліва ў 1-й аповесці) зусім пэўна адчуваюцца ў вобразна-стылёвым ладзе.

Проза Коласа наогул – гэта часта лірычна-эмацыянальная проза, якая вабіць моцнай пачуццёвай насычанасцю і выразнай экспрэсіўнасцю. Такое ж багацце эмацыянальна-ацэначных элементаў, шчодрае выяўленне аўтарскага пачуцця і яркая маляўнічасць фразы вызначаюць і ўласна пейзажную паэтыку трылогіі: «Шырокі гасцінец з двума радамі старых бяроз збягаў з горкі

раўнюсенечкаю сцежкаю кудысь на захад, і чым далей, тым, здавалася, гусцей стаялі гэтыя развіслыя тоўстыя дрэвы, усё болей і болей зніжаліся яны, а потым зліваліся ў адзін шнур і замыкаліся сабою самімі, як бы ўпіраліся ў лес і хаваліся за лінію небасхілу... Ёсць штось незвычайна прыгожае ў гэтых прывольных старасвецкіх шляхах Беларусі» [3, с.80].

Колас данёс да нас сваю трагічна-велічную душу, сваю, кажучы словамі Гегеля [4], «духоўную фізіяномію».

Як і ў «Новай зямлі», у трылогіі добра выпісана сцэна касьбы з удзелам дзядзькі Марціна і Лабановіча: «Трава была маладая, ранішняя раса рабіла яе вільготнаю і мяккаю. Добра наклёпаныя і наладжаныя косы толькі пасвіствалі. Трава лёгка паддавалася і пакорна лажылася ў роўныя пракосы» [3, с.679]. Гэты ўрывак напісаны вельмі дакладна і проста хораша, з добрай лірычнай падсветкай, якая сведчыць, што для Коласа ўласцівы лірычныя ноты. Вядома, такія лірычныя інтанацыі нараджаў яго ўласны вопыт фізічнай працы ў маладыя гады, пра якую пісьменнік з задавальненнем і з пэўным гонарам успамінаў ужо на схіле свайго жыцця (дарэчы, гэтая сцэна і напісана незадоўга да смерці пісьменніка і ўваходзіць у 3-ю аповесць).

Праніклівая лірычнасць, узнёсласць характарызуюць асобу галоўнага героя: вяртанне Лабановіча ў родны кут, у родную вёску Мікуцічы – гэта вяртанне ў цудоўны свет маленства, калі ўсё наваколле ўспрымаецца неяк інакш, вастрэй, больш шчымліва, эмацыянальна. І змены ў вёсцы, і сярод вяскоўцаў выяўляюцца таксама больш абвострана. Сустрэча Лабановіча з вёскай, з дзядзькам Марцінам, маці вымушае яго да роздуму. З замілаваннем і адначасова з сумам, з болем глядзіць герой на родныя мясціны, бо не можа глядзець інакш, раўнадушна.

Два кантрастныя малюнкі: лірычна-ўзнёслы – як светаўспрыманне, настрой апавядальніка, і акрэслены ў выразныя драматычныя ноты трагічны лёс жыхароў Мікуцічаў – як перасцярога, як напамінак, каб людзі не забываліся, што ўся навакольная прыгажосць патрабуе абароны і дапамогі чалавека. Гэтыя два рознастылёвыя апавядальныя пласты ствараюць адзіны, непарыўны мастацкі малюнак жыцця землякоў Лабановіча, а дакладней малюнак дзяцінства, юнацтва героя, яго памяці.

Колас умее прымусіць «працаваць» навакольную прыроду на агульны лірычна-эмацыянальны твор, на яго ідэйны змест, на тую ці іншую – можа, асабліва важную, вырашальную падзею, сітуацыю. У трылогіі «удзел» прыроды ў стварэнні агульнай атмасферы, у вызначэнні тону, у пэўнай эмацыянальнай акцэнтацыі асабліва мэтанакіраваны і шырокі. Свядомае падкрэсліванне відаць у падзагалоўках, загалоўку («У палескай глушы», «У глыбі Палесся», «На ростанях»).

Навакольнае жыццё, навакольны свет, найперш свет прыроды, перадаюцца праз свядомасць галоўнага героя, як свет ім успрыняты і перажыты. Прырода пастаянна жыве ў творы, увесь час прысутнічае, «дзейнічае». Адчуваецца, што аўтар валодае вобразным, паэтычным мысленнем. Таму часта сярод эпічнага апавядання чытаем лірычныя ўспаміны, адступленні, напісаныя добрай сакавітай мовай. Прычым, аўтарскія лірычныя адступленні гучаць неяк па-народнаму проста і хораша.

Прозу Коласа часта можна ўспрымаць і як своеасабліва пабудаваны адзіны лірычны маналог, у якім аб'ектыўная карціна свету можа быць адсунута на задні план унутраным светам аўтара. Як вядома, Колас не любіў быць «паэтам у прозе», бо ў падмурку яго творчасці ляжыць не разлезлае слязлівае пачуццё, а думка, прасякнутая пачуццём, эмацыянальна зараджаная гісторыя.

Перад намі лірык натуральнага глыбокага дыхання; у яго лірызм незвычайны, эмацыянальнасць, што складае аснову лірызму, шчасліва

дапаўняецца глыбокаю думкай. Думка, рацыянальны пачатак не аслабляе настрой душы, не стрымлівае і не прыглушае спантаннасць лірычнай плыні. На думку Ю.С. Пшыркова, «да стварэння эпасу ў прозе Я. Колас прыйшоў узбагачаны вопытам працы над эпасам у паэзіі, а г.зн., што і як паэт, і як празаік ён мысліў катэгорыямі шырокага філасофскага плана і адлюстроўваў жыццё ў паэтычных вобразах абагульняючага значэння» [5].

Лірызм у прозе – гэта не толькі манера весці апавяданне ад першай асобы; лірызм азначае перад усім інтэнсіўны і мэтанакіраваны ўдзел аўтара ў рэалізацыі і выяўленні характараў дзеючых асоб, у вызначэнні і асэнсаванні адносін чалавека да свету прыроды і да грамадства. Бывае, што гэты ўдзел мае залішне настойлівы характар, ад чаго паслабляецца самавыяўленне персанажаў на карысць апавядальніка, які не дае ім свабоды волі, права на самаразвіццё, а робіць рупарам сваіх ідэй, размоўнымі лялькамі. Пры такіх            перагрымках лірычнай манеры лірызм паслабляе свае ідэйна-выяўленчыя і эстэтычна-ацэначныя мажлівасці. Пісьменніку-лірыку больш чым эпіку патрэбна пачуццё меры, унутранага такту, каб не засціць вобразаў дзейных асоб сваёю персонай, не падказваць ім, не заглушаць іх галасоў, адчуваць сябе калі нават салістам, дык у хоры, а не саліраваць над хорам.

У Коласа ўмела можа паслабляцца лірычны пачатак і ўзмацняцца пачатак маляўніча-выяўленчы, апавядальны. Думаецца, можна гаварыць і пра якасную змену ў самім лірызме як форме выяўлення асабовасці аўтара на розных этапах яго жыцця.

Лірызм ранніх апавяданняў меў у сваёй аснове маральна-этычную арыентацыю, пафасам напаўнялі яго юначы маральны максімалізм, бескампрамісны суд сумлення. У гады сталасці гама лірычнага свячэння ўзбагацілася за кошт інтымна-эстэтычных пачуццяў сферамі, што пабуджалі мастака на лірычныя выказванні. Такімі і сталі прырода і маладосць – як дзве адвечныя крыніцы хараства, паўнагучнасці жыцця.

І таму лірызм трылогіі – гэта лірызм роздумна-філасафічны, галоўны стрыжань якога складае не маральная зацятасць і не эстэтычная апантанасць, а мудрая ўдумлівасць, боль і радасць пазнання ў з'явах, пражытых даўно, на золку жыцця, новага зместу, наяўнасць якога дзіцячая ці юначая свядомасць не заўважыла. Тут лірычны пачатак – гэта і лірызм, ужо ператвораны пад уздзеяннем духоўнай дасведчанасці аўтара ў гратэск, нават камізм, пачуццё ў прынцыпе рацыянальнае, якое ўзнікае ў працэсе выяўлення недарэчнасцей жыцця, несупадзенняў паміж сутнасцю і з'явамі, жаданым і наяўным. І наогул, як канстатуе І. Навуменка: «Мастацкі сінтэз, цэльнае, непасрэднае светаўспрыманне – найбольш характэрны момант у стылі пісьменніка. Прычына перавагі мастацкага сінтэзу над аналізам, відаць, у тым, што творчасць па духу вельмі блізкая да народнага светаўспрымання» [6].

Мы лічым, што стыль трылогіі нельга назваць лірычным ці павышана суб'ектыўным. Гэта стыль павышана-ацэначнага пісьма, стыль аксіялагізаваны, а што да эмацыянальных характарыстык, дык гэта стыль шырокага дыяпазону – ад лірызму да гратэску, ад сузіральнасці да інтэлектуальнай заглыбленасці, дакладней, яснасці слова. Метафарычнасць, годная паэзіі, свабодна сужываецца тут з простай інфармацыяй, прыўзнятасць і гумар часам абрываецца тымі цалкам аб'ектыўнымі формамі выяўлення духоўнага, якія называюцца паняццямі, суджэннямі ці ісцінамі факта, урэшце агульналюдскім вопытам.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Эльяшевич А.П.*** Лиризм. Экспрессия. Гротеск: О стилевых течениях в литературе социалистического реализма. Л., 1975. – 356 с.

2. ***Мельнікава З.П.*** Ля вытокаў лірызму новай беларускай літаратуры // Весці АН БССР: Сер. грам. навук, 1985. № 4. С. 94-99.
3. ***Колас Я.*** Збор твораў у 14-ці тамах. Т. 9. Трылогія «На ростанях». Мн., 1975. – 800 с.
4. ***Гегель Г.В.Ф.*** Эстетика. В 4 т. Т. 3. М., 1971. – 624 с.
5. ***Пшыркоў Ю.С.*** Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Мінск, 1982. – 367 с.
6. ***Навуменка І.Я.*** Якуб Колас: Духоўны воблік героя. Мінск, 1981. – 240 с.

*S U M M A R Y*

*The article investigates the specific character of the trilogy genre as an independendant artistic system in Yakub Kolas' works and substantiates the place and role of this genre in the making of the writer's artistic individuality. The article defines the ways which led Kolas the level of artistic harmony observed in the trilogy «Na Rosstaniakh», analyses the methods of laying fundamentals and conditions of epos in the trilogy genre, defines the role of psychologism in this process.*

*Поступила в редакцию 28.11.2001*

УДК 882.6

**В.Ф. Падстаўленка**

# Панарама сатырычных вобразаў у апавяданнях А. Мрыя

Андрэй Мрый вядомы шырокай грамадскасці больш як аўтар сатырычнага рамана «Запіскі Самсона Самасуя»(1929). Але дайшлі да нашага часу і іншыя творы: апавяданні ранняга і «узвышэнскага» перыяду творчасці, шматлікія мастацка-публіцыстычныя артыкулы. Вядома, што ў апошнія гады жыцця А. Мрыем былі напісаны другія празаічныя творы, у прыватнасці, раман «Жывы дом», але дагэтуль яны так і не знойдзены. Даследаванне творчасці празаіка было распачата толькі ў апошні час, і дзякуючы намаганням літаратуразнаўцаў (І. Чыгрына, Д. Бугаева, Я. Лецкі, З. Драздовай, П. Васючэнкі) творчасць пісьменніка была «рэабілітавана». Пісьменніцкая спадчына А. Мрыя патрабуе дэталёвага аналізу, што і падштурхнула да напісання гэтага артыкула, мэтай якога стала «сучаснае» прачытанне апавядальнага эпасу А. Мрыя, у прыватнасці, аналіз сатырычных вобразаў-тыпаў у малой прозе пісьменніка.

Аб'ектывізм пры адлюстраванні быцця, уласцівы аўтарскай манеры пісьменніка-сатырыка, быў рэалізаваны ім у працэсе напісання празаічных твораў, якія ахоплівалі разнапланавы спектр праблем. Глабальна-філасофскі сэнс апавяданняў быў дапоўнены аналізам многіх аспектаў грамадска-палітычнага і сацыяльна-асобаснага характару. Так, абразок «На кірмашы» перадае занепакоенасць аўтара парадаксальнасцю існавання і прыматам матэрыяльнага, фізічнага над ментальным пачаткам у чалавеку. У сатырычна-драматычным плане раскрываецца праблема псеўдадухоўнасці ў творы «Рабін». Апавяданні «Камандзір», «Няпросты чалавек», «Гармонія ў ружовым» адлюстроўваюць маральную мізэрнасць пэўных людзей на сумежжы дзвюх эпох. Канфлікт старога свету і новых законаў ляжыць у аснове твораў «Калектыў Яўмена», «Пятрок», «Але, Алена». Бюракратызм, неразумнасць